**Т.В. Кузьмініч**

***Да пытання аб фарміраванні інфармацыйнай культуры арганізатара народна-інструментальнай творчасці ў працэсе навучання***

Падрыхтоўка спецыяліста-арганізатара народна-інструментальнай творчасці ў межах ВНУ прадугледжвае засваенне студэнтамі шырокага спектра агульнагуманітарных, агульнанавуковых і прафесійных ведаў, у тым ліку "прынцыпаў і прыёмаў збірання, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі і правядзення навуковых даследаванняў у галіне музычнай культуры" (1). Уключэнне гэтай пазіцыі ў кваліфікацыйныя патрабаванні да спецыялістаў названай групы не выпадкова. Гэта абумоўлена асаблівасцямі сучаснай грамадска-палітычнай і эканамічнай практыкі, перш за ўсё інтэнсіўнасцю патокаў інфармацыі, зафіксаванай на розных матэрыяльных носьбітах, і неабходнасцю эфектыўнай арыентацыі ў ёй спецыяліста-гуманітарыя. Найбольш важным становіцца не веданне пэўнай сукупнасці фактаў, а ўменне арыентавацца ў інфармацыйных рэсурсах грамадства, весці мэтанакіраваны пошук інфармацыі, працаваць з тэкставым матэрыялам, самастойна складаць і афармляць дапаможны апарат навуковай працы (курсавой, дыпломнай работ, бакалаўрскай і магістэрскай дысертацый). Не выпадкова ў апошнія гады ўзнікла і стала актыўна абмяркоўвацца на старонках спецыяльнага друку пытанне аб неабходнасці фарміравання інфармацыйнай культуры асобы.

Зварот да гэтай тэматыкі быў звязаны перш за ўсё з інтэнсіўным (часам называюць лавінападобным) ростам і назапашваннем актуальнай інфармацыі, ускладненнем інфармацыйных патрэбнасцей членаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадства як суб'ектаў і аб'ектаў інфармацыйнай дзейнасці, удасканаленнем сродкаў фіксацыі інфармацыі, спосабаў яе прадстаўлення. Укараненне камп'ютэрных тэхналогій у навуковую, мастацка-прафесійную, вучэбную дзейнасць, у штодзённае жыццё дазволіла выйсці на якасна новы ўзровень вытворчасці, пошуку і спажывання інфармацыі, паставіла перад грамадствам шэраг этычных, прававых, эканамічных, тэхналагічных праблем, у прыватнасці: выбару прыярытэтных накірункаў пры стварэнні эканамічна выгадных і сацыяльна мэтазгодных крыніц і формаў прадстаўлення інфармацыі; выпрацоўкі і захавання этычных нормаў інфармацыйных паводзін асобы; выпрацоўкі аптымальных паводзін чалавека ва ўмовах недахопу і залішняй інфармацыі, дэзінфармацыі; неабходнасці эфектыўнай арыентацыі асобы ў інфармацыйных рэсурсах грамадства; абавязковага валодання сучаснай камп'ютэрнай тэхнікай; умення весці мэтанакіраваны, хуткі і эфектыўны пошук неабходнай інфармацыі; выпрацоўкі рацыянальных прыёмаў работы з тэкставай інфармацыяй і інш. Іншымі словамі, абвастрылася праблема адэкватных інфармацыйных паводзін асобы і фарміравання яе інфармацыйнай культуры.

Пад інфармацыйнай культурай разумеюць якасную характарыстыку жыццядзейнасці асобы ў сферы атрымання, захавання, перадачы і выкарыстання інфармацыі (2). Аб'ём зместу паняцця "інфармацыйная культура асобы", па словах Н.Б.Зіноўевай, мае светапоглядны, маральна-этычны, псіхалагічны, сацыяльны, тэхналагічны аспекты і ўключае ў сябе:

а) усведамленне сутнасці, законаў і заканамернасцей функцыяніравання інфармацыі ў грамадстве, тэарэтычнае асэнсаванне ролі інфармацыі ў кантэксце культуры і ўздзеяння яе на асобу;

б) выхаванне асабістай адказнасці, прынцыпаў і перакананняў, якія б супярэчылі ўспрыманню і маніпуліраванню сацыяльна дэструктыўнай інфармацыі і дэзінфармацыі;

в) выпрацоўку аптымальнай рэакцыі на паступаючую інфармацыю, яе адэкватнае ўспрыманне;

д) набыццё асобай неабходнага ўзроўню інфармаванасці як абавязковай умовы сацыялізацыі асобы, паспяховай вучэбнай і прафесійнай дзейнасці;

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

е) валоданне сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі, знаёмства з інфармацыйнымі рэсурсамі грамадства, выпрацоўка навыкаў пошуку неабходнай інфармацыі, яе захаванне, перапрацоўка, выкарыстанне (3).

Працэс фарміравання інфармацыйнай культуры чалавека доўжыцца ўсё жыццё і абумоўлены ўключанасцю яго ў пэўную сацыяльную сістэму, сферу прафесійнай, вучэбнай, самаадукацыйнай, палітычнай і іншай дзейнасці.

Фарміраванне інфармацыйнай культуры арганізатара народна-інструментальнай творчасці здзяйсняецца ў працэсе:

а) вучэбнай дзейнасці, у межах якой адбываецца рэпрадуцыйнае ўспрыманне інфармацыі, забяспечваецца атрыманне студэнтамі комплексу агульнанавуковых, мастацка-прафесійных ведаў, навыкаў практычнай работы;

б) навукова-даследчай работы, якая прадугледжвае актыўныя дзеянні студэнтаў па пошуку, зборы, апрацоўцы інфармацыі і атрыманні новых адзінак ведаў у галіне народна-інструментальнай культуры грамадства;

в) творчай дзейнасці, калі актуалізуецца эстэтычная інфармацыя, удасканальваецца прафесійна-выканальніцкае майстэрства;

г) самаадукацыйнай дзейнасці, якая накіравана на спажыванне эстэтычнай, мастацка-прафесійнай і іншай інфармацыі;

д) выхаваўчай дзейнасці ў пазааўдыторны час, якая прадугледжвае засваенне інфармацыі маральна-этычнага і эстэтычнага характару.

Неабходна, на наш погляд, звярнуць увагу на тэхналагічны аспект фарміравання інфармацыйнай культуры асобы студэнта — будучага арганізатара народна-інструментальнай творчасці. У вучэбным працэсе гэтаму аспекту не надаецца належнай увагі. Кантакты з бакалаўрамі кафедры народна-інструментальнай творчасці пры чытанні курса "Інфармацыйная культура спецыяліста", аналіз курсавых і навуковых бакалаўрскіх работ сведчаць аб тым, што студэнты недастаткова арыентуюцца ў сацыяльных інстытутах сістэмы дакументальных камунікацый (бібліятэкі, архівы, органы навуковай інфармацыі і інш.), да фондаў якіх ім мэтазгодна звяртацца пры распрацоўцы сваёй тэмы; часам яны не ўяўляюць сабе магчымасцей другаснай (фактаграфічнай, бібліяграфічнай) інфармацыі як крыніцы пошуку неабходнага матэрыялу, не ведаюць асноўных правіл афармлення навуковай работы і метадычнага апарату да яе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зразумела, арыентацыя ў інфармацыйных рэсурсах грамадства, валоданне камп'ютэрнымі тэхналогіямі, уменне весці эфектыўны пошук інфармацыі, рацыянальна працаваць з тэкставым матэрыялам не з'яўляюцца асноўнымі патрабаваннямі да спецыялістаў-арганізатараў народна-інструментальнай творчасці і адпаведна магістральнымі накірункамі вучэбнага працэсу па іх падрыхтоўцы. Аднак ва ўмовах актывізацыі навукова-даследчай дзейнасці ў галіне народна-інструментальнай культуры грамадства менавіта гэты аспект фарміравання інфармацыйнай культуры спецыяліста здольны забяспечыць інфармацыйна камфортную сітуацыю вучэбнай, навуковай, а ў будучым — мастацка-прафесійнай і навукова-даследчай дзейнасці. Якім чынам ён рэалізуецца пры падрыхтоўцы арганізатараў народна-інструментальнай творчасці ў межах Беларускага універсітэта культуры?

У вучэбны план падрыхтоўкі спецыялістаў быў уведзены курс "Камп'ютэрныя тэхналогіі ў музыцы", які прадугледжваў авалоданне студэнтамі навыкамі работы з нотным матэрыялам на ЭВМ. Разам з тым праблемы арыентацыі ў інфармацыйных рэсурсах грамадства, у тым ліку крыніцах другаснай інфармацыі, мэтанакіраванага пошуку і апрацоўкі інфармацыі, работы з тэкставым матэрыялам застаюцца практычна па-за ўвагай пры падрыхтоўцы названай групы спецыялістаў. Яны часткова закранаюцца (і гэта непазбежна) пры кансультацыйнай дапамозе з боку выкладчыкаў-кіраўнікоў падчас напісання студэнтамі навуковых прац, рэфератаў, бакалаўрскіх, магістэрскіх даследаванняў, пры звартанні студэнтаў у бібліятэку з мэтай пошуку неабходнай літаратуры, пры інфармацыйна-тэхналагічнай самаадукацыі, калі адсутнасць ці недахоп адпаведнай інфармацыі вымушаюць карыстальніка (студэнта) мэтанакіравана яе шукаць і засвойваць, часам метадам спроб і памылак. Гэтага, на наш погляд, недастаткова, асабліва калі размова ідзе пра падрыхтоўку бакалаўраў і магістраў, якія абавязкова павінны займацца навуковымі даследаваннямі і пісаць адпаведныя ўзроўню іх падрыхтоўкі працы.

Працэс фарміравання тэхналагічнага аспекту інфармацыйнай культуры будучых арганізатараў народна-інструментальнай творчасці, на наш погляд, павінен адбывацца на працягу ўсяго тэрміну навучання іх ва універсітэце і ўключаць наступныя кампаненты:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— правядзенне ў першы год навучання экскурсіі па бібліятэцы Беларускага універсітэта культуры як аднаго з абавязковых элементаў выхаваўчай работы куратараў;

— правядзенне "Дзён інфармацыйнай культуры" ці "Дзён бібліяграфіі" студэнтамі факультэта бі бліятэчна-інфармацыйных сістэм у межах вывучэння імі курса "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы ў бібліятэцы" для студэнтаў факультэта мастацкай творчасці. Гэта пажадана рабіць у некалькі этапаў: на I курсе — у межах дысцыпліны "Уводзіны ў спецыяльнасць", на III — перад напісаннем курсавых работ па педагогіцы, інструментазнаўстве і інструментоўцы; на IV і V — падчас праходжання педагагічнай і вытворчай практыкі і правядзення бакалаўрскіх і магістэрскіх даследаванняў;

— распрацоўку метадычных рэкамендацый па выкананні студэнтамі пісьмовых прац (дырыжорскіх і выканальніцкіх анатацый, курсавых і дыпломных работ па спецыяльных дысцыплінах);

— стварэнне вучэбна-метадычнага даведніка па дысцыпліне "Інфармацыйная культура спецыяліста-арганізатара народна-інструментальнай творчасці";

— чытанне студэнтам курсаў і практыкумаў па асваенні камп'ютэрных тэхналогій;

— абавязковае ўвядзенне ў вучэбныя планы падрыхтоўкі бакалаўраў курса "Інфармацыйная культура спецыяліста", асноўнай мэтай якога з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў цэласнага ўяўлення аб асаблівасцях і структуры інфармацыйных рэсурсаў грамадства, магчымасцях іх выкарыстання, выпрацоўка ўменняў і навыкаў арыентацыі ў разнастайных крыніцах першаснай і другаснай інфармацыі, работы з тэкставым матэрыялам.

Вышэйадзначаны курс чытаецца на бакалаўрыяце з 1997 г. У межах яго прадугледжана правядзенне лекцыйных і лабараторных заняткаў, выкананне студэнтамі самастойных практычных заданняў. На лекцыях бакалаўры мастацкіх спецыялізацый атрымліваюць веды аб спецыфіцы, відах і ўласцівасцях сацыяльнай інфармацыі; аб інфармацыйных рэсурсах грамадства як базе задавальнення інфармацыйных патрэб па тэорыі музыкі, гісторыі сусветнай і айчыннай культуры, па фальклоры і інш.; аб асноўных каналах захавання і распаўсюджвання сацыяльнай інфармацыі; аб магчымасцях бібліяграфічных дапаможнікаў, бібліяграфічных,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фактаграфічных, паўнатэкставых баз даных, электронных каталогаў як крыніц пошуку неабходнай інфармацыі ў сферах мастацтва і культуры. На лабараторных занятках прадугледжана выпрацоўка ўменняў і навыкаў пошуку інфармацыі па рэтраспектыўных і бягучых, універсальных, галіновых, тэматычных, праблемна-комплексных, персанальных, краязнаўчых і краіназнаўчых паказальніках; фармулёўкі запытаў пры звяртанні ў пэўныя сацыяльныя інстытуты сістэмы дакументальных камунікацый; рацыянальнай работы з тэкставым матэрыялам (уменне складаць план артыкула, фармуляваць тэзісы, выпісваць і афармляць цытаты, рабіць бібліяграфічнае апісанне, ствараць даведачныя анатацыі, аўтарскія рэзюме, вызначаць ключавыя словы і прадметныя рубрыкі). Асаблівую ўвагу мэтазгодна надаваць асаблівасцям апрацоўкі вынікаў пошуку інфармацыі і афармленню бібліяграфічнага спіса да бакалаўрскай работы, які фарміруецца на працягу ўсіх лабараторных заняткаў на аснове разнастайных крыніц другаснай інфармацыі і з'яўляецца ўмовай допуску да здачы заліку па дысцыпліне "Інфармацыйная культура спецыяліста".

Такім чынам, мэтанакіраваная работа педагагічнага калектыву па фарміраванні ў студэнтаў інфармацыйнай культуры (у тым ліку і тэхналагічнага аспекту) з'яўляецца адным са шляхоў удасканалення навучання будучых арганізатараў народна-інструментальнай творчасці. Гэта, на наш погляд, забяспечыць падрыхтаванасць выпускнікоў спецыялізацыі да эфектыўнага выканання імі прафесійных абавязкаў, правядзення разнастайнай навукова-даследчай работы.

---

1. Кузьмініч М. Мастацкая творчасць: універсітэцкая падрыхтоўка кадраў.— Мн., 1998. — С.138.

2. Информационная культура личности: прошлое, настоящее, будущее: Тезисы докладов на Междунар. науч. конф., Краснодар — Новороссийск, 11 — 14 сент. 1996 г. — Краснодар, 1996. — С.7.

3. Зиновьева Н. Информационная культура личности: Учеб. пособие для студ. вузов культуры и искусства. — Краснодар, 1995. — С.4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ